ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

*Серыя*
***«Святыні Вялікага Княства Літоўскага»***

# УНІЯЦКІЯ ЦЭРКВЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА XVII СТ.

МАТЭРЫЯЛЫ
ГЕНЕРАЛЬНЫХ
ВІЗІТАЦЫЙ

Мінск
НГАБ
2021

УДК [271.4–9.:930.2+271.4.–523/–526:657(093.2)]
(474.5/476ВКЛ)“16”
ББК [86.377+63.2](4Беи)

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Укладальнік:
*Д. В. Лісейчыкаў*

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук, прафесар *В. Ф. Голубеў*;
кандыдат гістарычных навук *А. Б. Доўнар*

Праца выканана ў рамках планавай навуковай тэмы
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі
*«Матэрыялы генеральных візітацый цэркваў і манастыроў
Вялікага Княства Літоўскага XVII–XVIII стст.»*

ISBN 978-985-90566-1-1

© Дзяржаўная ўстанова
«Нацыянальны гістарычны
архіў Беларусі», 2021

# ЗМЕСТ

**Спіс скарачэнняў** . . . . . . 6

**ПРАДМОВА** . . . . . . 7

**ПРАКТЫКА ГЕНЕРАЛЬНЫХ ВІЗІТАЦЫЙ У КІЕЎСКАЙ УНІЯЦКАЙ МІТРАПОЛІІ XVII–XVIII стст.** . . . . . . 9

**Генеральныя візітацыі ўніяцкіх цэркваў у ВКЛ да 1674 г.** . . . . . . 10

**Генеральныя візітацыі ўніяцкіх цэркваў у ВКЛ у 1674–1795 гг.** . . . . . . 18

**ВІЗІТЫ ЦЭРКВАЎ XVII ст.: СЮЖЭТЫ ПА-ЗА ФАРМУЛЯРАМ** . . . . . . 36

**Прастора і арыентацыя на мясцовасці** . . . . . . 36

**Кошты і грашовыя разлікі** . . . . . . 39

**Рудыменты царкоўнаславянскай і «рускай» моў** . . . . . . 42

**Розныя «народы» і іх артэфакты** . . . . . . 44

**Тытулатура цэркваў і капліц** . . . . . . 46

**Цудатворныя абразы** . . . . . . 51

**ДАКУМЕНТЫ** . . . . . . 53

**Агульная характарыстыка публікуемых дакументаў і правілы перадачы тэксту** . . . . . . 53

**1. ПЕРАДВІЗІТАЦЫЙНАЯ ДАКУМЕНТАЦЫЯ** . . . . . . 55

1.1. Указ мітрапаліта кіеўскага, галіцкага і ўсёй Русі Кіпрыяна Жахоўскага аб пачатку правядзення генеральнай візітацыі цэркваў Мінскага афіцыялату («сабору»). 02.09.1681 . . . . . . 55

1.2. Указ мітрапаліта кіеўскага, галіцкага і ўсёй Русі Кіпрыяна Жахоўскага мінскаму афіцыялу Гедэону Шумлянскаму аб зборы падатку за правядзенне візітацыі цэркваў Мінскага афіцыялату («сабору»). 22.10.1681 . . . . . . 56

**2. МАТЭРЫЯЛЫ ГЕНЕРАЛЬНЫХ ВІЗІТАЦЫЙ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57

2.1. Манастыр у м. Вольна Навагрудскага павета
20.05.1675 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .57

2.2. Цэрквы Клецкай, Навагрудскай, Нясвіжскай
і Цырынскай пратапопій
1680–1681 гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .59

2.3. Царква ў в. Любішчыцы Слонімскага павета
07.03.1681 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106

2.4. Цэрквы ў г. Лідзе Лідскага павета
18.06.1681 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107

2.5. Цэрквы Бабруйскай, Барысаўскай, Блонскай, Даўгінаўскай, Ігуменскай,
Лагойскай, Мінскай, Мядзельскай і Пухавіцкай пратапопій. 1681–1682 гг.. . . . . . . . . . 108

2.6. Цэрквы Полацкай пратапопіі. 1684 г. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 157

2.7. Кафедральная саборная царква ў г. Пінску Пінскага павета
04.04.1695 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 176

2.8. Цэрквы Ваўкавыскай, Гродзенскай, Клецкай, Нясвіжскай,
Слонімскай і Цырынскай пратапопій. 1696–1697 гг. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 182

2.9. Царква ў в. Салтанаўшчына (Салтанава Гаць) Навагрудскага павета
22.03.1696 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 248

2.10. Царква ў в. Моладава Пінскага павета
10.05.1698 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 250

2.11. Фальсіфікат
Царква ў в. Дзмітравічы Аршанскага павета
10.01.1621 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 251

**АСАБОВЫ ПАКАЗАЛЬНІК** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 253

**ГЕАГРАФІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 274

# ПРАДМОВА

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі з'яўляецца самым буйным у краіне сховішчам дакументальных крыніц па гісторыі ўсіх канфесій зямель былога Вялікага Княства Літоўскага XV – пачатку XX ст. З сярэдзіны XIX ст. гэтыя крыніцы, якія захоўваліся ў той час пераважна ў Віленскім і Віцебскім цэнтральных архівах старажытных актаў, а таксама ў фамільных і кансісторскіх архівах, не раз рабіліся аб'ектам увагі публікатараў шэрагу археаграфічных выдавецкіх серый. Археографы Расійскай імперыі пры дапамозе выбарачнай публікацыі рабілі акцэнт на «рускім» кампаненце культурнага і рэлігійнага жыцця ВКЛ і спрабавалі атаясаміць мясцовую «русчызну» XVI–XVII стст. з «рускім» і «расійскім» у рэаліях XIX ст. Складальнікі зборнікаў дакументаў савецкага часу выкарыстоўвалі архіўныя матэрыялы, каб паказаць адмоўны ўплыў рэлігіі ў цэлым і царкоўных інстытутаў у прыватнасці на развіццё культуры і нацыятворчыя працэсы. Аднак значная частка дакументаў па гісторыі канфесій увогуле заставалася па-за ўвагай навуковай грамадскасці. У першую чаргу гэта тычыцца масавых крыніц царкоўнага паходжання – метрычных кніг, спісаў парафіян і пратаколаў візітацый. Толькі ў канцы XX ст. з узрастаннем цікавасці да генеалогіі і сямейнай гісторыі гэтыя крыніцы пачалі актыўна выкарыстоўвацца даследчыкамі. Да сённяшняга дня працы на канфесійную тэматыку часта грунтуюцца на апрацаванні пераважна заканадаўчых і іншых рэгламентуючых актаў. Масавыя крыніцы царкоўнага паходжання выкарыстоўваюцца выразна недастаткова.

Варта адзначыць, што матэрыялы часта раскіданы па архівасховішчах розных дзяржаў. Часам даходзіць да казусаў – пачатак дакумента знаходзіцца ў адной краіне, рэшта – у іншай. Многія дакументы захаваліся толькі ў выглядзе копій у архівах асобных храмаў альбо іншых духоўных устаноў. Таму асаблівую каштоўнасць набывае збор пад адной вокладкай кавалкаў своеасаблівай дакументальнай мазаікі.

Дадзенай кнігай распачынаецца новая выдавецкая серыя Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі «Святыні Вялікага Княства Літоўскага». Галоўная задача серыі – у сістэматызаваным выглядзе ажыццявіць публікацыю масавых крыніц па гісторыі асноўных канфесій на тэрыторыі ВКЛ XVI–XVIII стст. Найбольш важным і інфарматыўным відам такіх крыніц з'яўляюцца пратаколы генеральных візітацый (епіскапскіх праверак). Публікацыя пратаколаў візітацый дазволіць падрыхтаваць навукова-інфармацыйную базу для далейшых даследаванняў. Яна таксама спрыяе своеасаблівай «легалізацыі» масавых крыніц царкоўнага паходжання, што дазваляе адысці ад састарэлых схем і пачаць успрымаць Царкву не ў якасці суб'екта сацыяльна-эканамічных адносін, а ў якасці паўнавартаснага ўдзельніка культурна-рэлігійных і грамадска-палітычных працэсаў.

У першай кнізе серыі публікуюцца ўсе вядомыя на сённяшні дзень матэрыялы генеральных візітацый уніяцкіх цэркваў і манастыроў ВКЛ XVII ст. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі працягвае працу па падрыхтоўцы наступных кніг серыі, куды ўвойдуць апісанні кальвініснкіх збораў ВКЛ XVII–XVIII стст., а таксама матэрыялы генеральных візітацый цэркваў Кіеўска-Віленскай епархіі 1763–1766 гг.

Падрыхтоўка, напісанне і выданне кнігі былі б немагчымымі без дапамогі калег і аднадумцаў. Выказваю шчырую падзяку дырэктару Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь **Віктару Курашу** і дырэктару Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі **Дзмітрыю Яцэвічу** за ўсебаковую падтрымку і дапамогу ў арганізацыі замежных камандзіровак для выяўлення дакументаў, а таксама Галіне **Акуловіч**, Альбіне **Аляксандравай**, Зінаідзе **Антановіч**, Вользе **Бабковай**, Ігару **Бараноўскаму** (г. Брэст), Герману **Брэгеру**, Дар'і **Бунеевай**, Анджэю **Бучылу** (г. Варшава, Польшча), Войцеху **Вальчаку** (г. Беласток, Польшча), Андрэю **Вашкевічу** (г. Гродна), Дзмітрыю **Вінаходаву** (г. Санкт-Пецярбург, Расія), Мікалаю **Волкаву**, айцу Сяргею **Гаеку**, Ірыне **Герасімавай** (г. Санкт-Пецярбург, Расія), Анджэю **Гілю** (г. Люблін, Польшча), Яўгену **Глінскаму**, Аляксандру **Грушу**, Радаславу **Дабравольскаму** (г. Супрасль, Польшча), Уладзіміру **Дзянісаву**, Алегу **Духу** (г. Львоў, Украіна), Аляксандру **Жлутку**, Людміле **Івановай**, Уладзіміру **Казлову**, айцу Уладзіміру **Камінскаму** (г. Ліда), Кірылу **Карлюку**, Ірыне **Каўганавай**, Рамуцісу **Курпэ** (г. Вільнюс, Літва), Галіне **Кутуковай**, Андрэю **Латушкіну**, Юрыю **Лаўрыку**, Леаніду **Лаўрэшу** (г. Ліда), айцу Сергію **Лепіну** (в. Ракаў Валожынскага раёна), Максіму **Макараву**, Надзеі **Марозавай** (г. Вільнюс, Літва), Уладзіміру **Марозу** (г. Львоў, Украіна), айцу Кірылу **Міронаву** (г. Рым, Італія), Але **Мяснянкінай** (г. Брэст), Ежы **Наздрыну-Платніцкаму** (г. Вена, Аўстрыя), Мікалаю **Нікалаеву** (г. Санкт-Пецярбург, Расія), Рэйнісу **Норкарклсу** (г. Рыга, Латвія), Валерыю **Пазднякову**, Сяргею **Палехаву** (г. Масква, Расія), Ірыне **Скачыляс** (г. Львоў, Украіна), Юрыю **Снапкоўскаму**, Аляксандру **Сушу**, Анатолю **Сцебураку**, Альфонсасу **Тамулінасу** (г. Вільнюс, Літва), Вадзіму **Урублеўскаму**, айцу Яўгену **Усошыну**, Галіне **Флікоп-Світа**, Леаніду **Цімашэнку** (г. Драгобыч, Украіна), Рыме **Цыцэнене** (г. Вільнюс, Літва), Віргініі **Чыюнскене** (г. Вільнюс, Літва), Міндаўгасу **Шапока** (г. Вільнюс, Літва), Валянціне **Яноўскай**.

*Дзяніс Лісейчыкаў*
красавік 2021 г.

У60 **Уніяцкія цэрквы Вялікага Княства Літоўскага XVII ст.:** матэрыялы генеральных візітацый / уклад. Д. В. Лісейчыкаў. – Мінск : НГАБ, 2021. – 320 с. – (Святыні Вялікага Княства Літоўскага).

ISBN 978-985-90566-1-1

Кніга распачынае выдавецкую серыю Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі «Святыні Вялікага Княства Літоўскага». Галоўная задача серыі – у сістэматызаваным выглядзе ажыццявіць публікацыю масавых крыніц па гісторыі асноўных канфесій на тэрыторыі ВКЛ XVI–XVIII стст. Найбольш важным і інфарматыўным відам такіх крыніц з'яўляюцца пратаколы генеральных візітацый (епіскапскіх праверак). У першай кнізе серыі публікуюцца ўсе вядомыя на сённяшні дзень матэрыялы генеральных візітацый уніяцкіх цэркваў і манастыроў ВКЛ XVII ст.

Прызначаецца для шырокага кола чытачоў – прафесійных навукоўцаў, гісторыкаў Царквы, а таксама для краязнаўцаў і ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй.

**УДК [271.4–9.:930.2+271.4.–523/–526:657(093.2)](474.5/476ВКЛ)"16"**
**ББК [86.377+63.2](4Беи)**